**Сахар В. А., Заяц Н. В. (Мінск, Беларусь)**

**“Радзіва «Прудок»” Андруся Горвата як узор літаратуры нон-фікшн**

У сучасных умовах вялікую папулярнасць набыў такі жанр, як нон-фікшн. Гэта тлумачыцца цікавасцю маладога пакалення найперш літаратурай, у якой дамінантай становіцца не мастацкае, а фактаграфічна дакладнае адлюстраванне рэчаіснасці. У шырокім разуменні гэта і ёсць нон-фікшн – творы, у якіх не дапускаецца выдумка, апісваюцца рэальныя гісторыі, падзеі выкладаюцца праз прызму ўспрымання аўтара.

Многія беларускія пісьменнікі сёння спрабуюць прыцягнуць увагу чытачоў да сваёй творчасці менавіта пішучы “на злобу дня”, фіксуючы жыццёвыя факты і ўласныя рэфлексіі без удзелу вымыслу. У сучаснай беларускай літаратуры творы нон-фікшн прадстаўлены вельмі шырока, прыцягваюць увагу крытыкаў, карыстаюцца папулярнасцю ў чытачоў. Адзін з найбольш яркіх пісьменнікаў, што працуе ў жанры нон-фікшн, – Андрусь Горват. Былы журналіст, дворнік Купалаўскага тэатра, “дармаед”, гаспадар вясковай сялібы літаральна ўварваўся ў айчынную літаратуру дэбютнай кнігай “Радзіва «Прудок»” (2017).

Кніга, напісаная ў жанры дзённіка, цалкам укладваецца ў канцэпцыю нон-фікшн. Яна “вырасла” з пастоў-нататак аўтара на асабістай старонцы ў Фэйсбуку, таму “генетычна” яе можна лічыць і прыкладам “сеткавай літаратуры”. Па словах аўтара, “літаратура можа нараджацца як на паперы, так і ў інтэрнэце. У кожнага аўтара ёсць свой зручны інструмент, а можна і сумяшчаць: штосьці запісаць анлайн, штосьці пакінуць у нататніку. Нават адзін твор можа фарміравацца рознымі спосабамі – няма аніякіх правілаў” [2, с. 50]. У такім нетрадыцыйным паводле спосабу стварэння тэксце ўздымаюцца “вечныя” для літаратуры праблемы і тэмы.

Думаецца, адна з галоўных ідэй кнігі заключаецца ў сцвярджэнні каштоўнасці “простых рэчаў”: чым больш з’яўляецца новых тэхналогій, тым больш чалавек пачынае цаніць “прастату”. У пэўным сэнсе А. Горват – гэта сучасны Рабінзон Круза, які не па выпадковасці, а свядома пакінуў цывілізацыю з яе выгодамі і вярнуўся да першаасноў: “*Суседка адключыла мяне ад электрычнасці (спужалася, што яе хата згарыць праз мяне). Я купіў у краме свечку, сшытак і аловак. І ведаеце што? Так крута! Так проста. Так зразумела ўсё. Ежа – гэта вогнішча. Святло – гэта агонь. Тэкст – гэта папера*” [1, с. 38]. Сярод нямногіх рэштак цывілізацыі ў героя застаецца “радзіва”, якое вяшчае рознымі галасамі: маці, дзеда і нават іншапланетнай істоты… Такім чынам герой наладжвае кантакт не столькі з сучаснасцю і яе праблемамі, колькі з мінулым, з сям’ёй, “космасам” вёскі, адкуль ідуць карані, – з Сусветам.

У дзённіку А. Горвата арыгінальна трансфармавалася традыцыйная для нацыянальнай літаратуры ХХ стагоддзя тэма – жыццё былых вяскоўцаў, якія пераехалі ў горад. Аўтар не з’язджае з вёскі, а, наадварот, вяртаецца на радзіму бацькі, у Прудок, які становіцца для яго цэлым космасам, самай вялікай каштоўнасцю. Тут ён можа басанож хадзіць па зямлі, адчуваць уласную

сутнасць, вучыцца жыць без сацыяльных масак: “*Самае цяжкае ў вясковым жыцці – гэта адсутнасць магчымасці надзяваць маску*” [1, с. 231].

Настрой кнігі вызначаюць разнапланавыя эмоцыі: радасць жыцця суседнічае з тугой, здаровы гумар – з філасофскімі разважаннямі. Пісьменнік, ён жа і герой, з гумарам занатоўвае непрыдуманыя, будзённыя здарэнні свайго новага, вясковага існавання, але за смехам не губляецца сур’ёзнае. З вясёлых нататак пра паўсядзённае ў выніку вырастае глыбокі твор пра пошукі чалавекам дарогі да сябе самога. Герой шукае і знаходзіць сябе ў тым ліку дзякуючы спробам зразумець іншых, праз назіранні за людзьмі – вяскоўцамі і гараджанамі. “*Нядаўна ехаў у метро і глядзеў на твары людзей з вышэйшай адукацыяй. Кожны другі – пляменнік Бога. Астатнія – такое ўражанне – увесь час бегаюць, збіраюць паперкі, каб пацвердзіць, што і яны ягоныя пляменнікі. У тым самым метро сядзелі два просценькія мужыкі. Яны былі шчаслівыя, бо весела і шчыра варушылі сваімі вусамі. І калі вышэйшая адукацыя пазбаўляе права весела варушыць вусамі – ну яе к чорту*” [1, с. 6].

З “адукаванага” горада герой едзе ў вёску. Менавіта там, на адзіноце, у дзедавай хаце, ён спасцігае сябе: праз роздум над гісторыяй уласнага роду і краіны ўвогуле, праз зносіны з каларытнымі персанажамі-сялянамі, за кожным з якіх стаіць рэальны чалавек з яго праўдай, турботамі і дзівацтвамі. Тым не менш супрацьстаянне вёскі з горадам у душы героя няма, як гэта адбывалася, напрыклад, з персанажамі М. Стральцова. А. Горват сцвярджае думку пра тое, што “*нас фарміруе не вёска і не горад, а ўнутраны космас*”.

Гісторыя аўтара і гісторыі жыхароў Прудка выклікалі вялікі рэзанас у чытацкай аўдыторыі. Асабістае ператварылася ва ўніверсальнае: кожны знайшоў у фрагментах-здарэннях і развагах аўтара тое, што сугучна ўласным думкам, што карэлюецца з жыццёвым досведам. У творы шмат сентэнцый, якія прэтэндуюць на ўніверсальнасць і ўспрымаюцца як філасофскія: “*Жыццё – гэта шарлотка белая, шарлотка чорная*” [1, с. 103], “*Само жыццё з’яўляецца перашкодай, каб ведаць пра яго ўсё*” [1, с. 195], “*Калі глядзець наперад, можна ўбачыць сваю спіну*” [1, с. 160]. Сярод іх і словы: “*Космас, я нічога пра цябе не ведаю, але ты клёвы*” [1, с. 125]. Гэтую фразу можна трактавапць і як прызнанне ў любові да вёскі Прудок і да Сусвету, і як сцвярджэнне радасці, і як прыняцце сябе самога, свайго ўласнага “космасу” такім, які ён ёсць.

Без перабольшання можна сцвярджаць, што дзённік “Радзіва «Прудок»” А. Горвата – не толькі адзін з найбольш таленавітых беларускіх узораў жанру нон-фікшн, але і мастацкі феномен, значная з’ява сучаснага літаратурнага працэсу.

Літаратура

1. Горват, А. Радзіва “Прудок” : дзённік / А. Горват. – Мінск : Медисонт, 2017. – 248 с.
2. Пісьменнік Андрусь Горват: “Нас фарміруе не вёска і не горад, а ўнутраны космас” : інтэрв’ю [Электронны рэсурс] // Большой. – 2018. – 18 июля. – Рэжым доступу: https://bolshoi.by/persona/gorvat/. – Дата доступу: 09.10.2020.